## Секция 14

# ПОЛИТИЧЕСКИЕ ПРОБЛЕМЫ И ИСТОРИЧЕСКИЙ ОПЫТ СОЦИАЛЬНО-ЭКОНОМИЧЕСКОГО РАЗВИТИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

***А.С. Каспяровіч***
*БДЭУ (Мінск)*
*Навуковы кіраўнік* ***І.І. Сацукевіч***

## ГЕНЕЗІС СТАРОГА ЗАМКА У ГРОДНЕ

Гродзенскі Стары замак з’яўляецца візітнай карткай горада Гродна. Ён прыцягвае тысячы турыстаў з розных краін сваей прыгажосцю і гістарычным мінулым, звязаным з існаваннем Вялікага княства Літоўскага, а пазней — Рэчы Паспалітай. Мноства вялікіх падзей адбылося на гэтым месцы: яно было рэзідэнцыяй князя Вітаўта, польскага караля Стэфана Баторыя, тут праходзіў апошні сейм Рэчы Паспалітай у 1793 г. З развіццём цікавасці да беларускай культуры з’явілася неабходнасць ва ўдакладненні і паглыбленні нашых ведаў пра помнікі дойлідства, а таксама ў распаўсюджванні гэтай інфармацыі.

У сваей працы я вырашыла даць адказы на такія пытанні: «як быў пабудаваны замак?», «чаму менавіта тут знаходзіліся рэзідэнцыі адных з самых значных кіраўнікоў Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай?», «ці змяніўся знешні выгляд замка на працягу гісторыі яго існавання?» Таму мэтай работы з’яўляецца даследаванне гісторыі і дынамікі развіцця Старога замка ў Гродне, а асноўнымі задачамі — выяўленне пахождання замка, вывучэнне яго гісторыі ў часы Вітаўта, разгледжанне асаблівасцей змены замка у якасці рэзідэнцыі Стэфана Баторыя і выяўленне прычыны заняпаду Старога замка ў XVIII–XIX ст.ст.

Сваё даследванне я пачала з апісання першых пабудоў на Замкавай гары ў Гродне XI–XIV ст.ст., якія сталі асновай для Старога замка. Праз паўстагоддзя ўнутры была пабудавана Ніжняя царква, якая згарэла ў 1183 г. Замест яе з’явілася Верхняя царква. Трэба дадаць, што замак адыгрываў вялікую ролю ў стратэгічным плане: тут адбылося шмат бітваў. Аднак стары драўляны замак ужо з цяжкасцю вытрымаў напады добра падрыхтаваных ворагаў. Вялікі князь Вітаўт пабудаваў каменны гатычны замак. З’явіліся новыя магутныя сцены, моцныя вежы, але да нашага часу ніводная з іх не дажыла. Унутры змяшчаўся княскі палац. Паступова замак страчвае сваю абарончую функцыю і становіцца каралеўскай рэзідэнцыяй Стэфана Баторыя. Па яго загадзе замак быў цалкам перабудаваны ў XVI ст. Цяпер галоўным у рэнесансавым замку стаў шыкоўны каралеўскі палац з мармуровымі, паркетнымі падлогамі, камінамі, пячамі. Побач з замкам знаходзіліся маленькія

хаткі прыслугі. Падчас Паўночнай вайны ў 1708 г. замак быў пашкоджаны і пачаў паступова прыходзіць ў заняпад. Апошні этап маёй навуковай працы апісвае XIX–XX ст.ст., калі замак ужо страціў сваю веліч пасля падзелаў Рэчы Паспалітай. Паўплывала на гэта і знаходжанне Беларусі ў складзе Расійскай імперыі. У 1925 г. тут быў заснаваны музей. Тады было таксама праведзена шмат даследванняў, якія дапамаглі даведацца больш аб славутым мінулым замка.

Стары замак з'яўляецца неад'емнай часткай беларускай культуры, у яго гісторыі адлюстравана і гісторыя Гродзеншчыны, а веданне развіцця замка неабходна да разумення гісторыі нашай краіны. Замак вельмі цікавіць гродзенцаў, жыхароў іншых гарадоў ды краін, таму новыя даследаванні па гэтай тэме будуць вельмі карыснымі дзеля дадатка да існуючай інфармацыі. Тым больш, маё даследаванне звяртае ўвагу на гістарычную каштоўнасць Старога замка і дапаможа вырашыць актуальнае пытанне яго рэканструкцыі, якая павінна пачацца ўжо у 2017 г.

**Літаратура**


1. *Краўцэвіч, А. К.* Гродзенскі замак / А. К. Краўцэвіч. — Мінск : Юнацтва, 1993. — 47 с.
2. *Трусаў, А. А.* Стары замак у Гродне XI–XVIII ст.ст. / А. А. Трусаў, В. Е. Собаль, Н. І. Здановіч. — Мінск : Навука і тэхніка, 1993. — 152 с.



***К.И. Костиневич***
*БГЭУ (Минск)*
*Научный руководитель* ***Н.Ю. Веремеев*** *— канд. полит. наук*


## ПРОБЛЕМЫ РЫНКА ПОЛИТИЧЕСКОГО КОНСАЛТИНГА В БЕЛАРУСИ

В современном государстве возрастает роль политического консультирования при принятии политических решений, осуществлении государственного и местного управления, а также в деятельности политических партий, общественных объединений, бизнеса, СМИ и иных институтов.

Политический консалтинг — это «научное направление, изучающее деятельность, обеспечивающую потребности общества, выделенных групп индивидуумов в достижении целей направленного изменения существующей социально-политической ситуации» [1, с. 18].

Как правило, данным видом деятельности занимаются центры политического консультирования, аналитические центры и структуры GR. В Беларуси широко распространились аналитические центры («фабрики мысли»).

Целью данной работы являлось определение основных проблем рынка политического консультирования в Беларуси.

Для получения данных по изучаемой проблеме был проведен анкетный экспертный опрос представителей негосударственных аналитиче-